CENTRALNA
KOMISJA
EGZAMINACYJNA

| WYPEŁNIA ZDAJĄCY | |
|---|---|
| KOD | PESEL |
| | |

*Miejsce na naklejkę.*
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

**Egzamin maturalny** ***Formuła 2023***

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Symbol arkusza*
MMBB-P0-**100**-2305

DATA: **16 maja 2023 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS TRWANIA: **210 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

| WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY |
|---|
| Uprawnienia zdającego do: |
| ☐ dostosowania zasad oceniania. |

**Przed rozpoczęciem pracy z arkuszem egzaminacyjnym**

1. Sprawdź, czy nauczyciel przekazał Ci **właściwy arkusz egzaminacyjny**, tj. arkusz we **właściwej formule,** z **właściwego przedmiotu** na **właściwym poziomie**.
2. Jeżeli przekazano Ci **niewłaściwy** arkusz – natychmiast zgłoś to nauczycielowi. Nie rozrywaj banderol.
3. Jeżeli przekazano Ci **właściwy** arkusz – rozerwij banderole po otrzymaniu takiego polecenia od nauczyciela. Zapoznaj się z instrukcją na stronie 2.

Układ graficzny
© CKE 2022

## Instrukcja dla zdającego

1. Sprawdź, czy ten arkusz egzaminacyjny zawiera 19 stron (zadania 1–12). Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Na pierwszej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
3. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
4. W wyznaczonym miejscu zapisz numer tematu wybranego do realizacji.
5. Wypracowanie zapisz w miejscu na to przeznaczonym.
6. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w tabelkach przeznaczonych dla egzaminatora. Tabelki są umieszczone na marginesie przy każdym zadaniu.
8. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
9. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
10. Możesz korzystać ze słownika języka białoruskiego.

**Lista lektur obowiązkowych w roku szkolnym 2022/2023 i 2023/2024 (zgodna z wymaganiami egzaminacyjnymi)**

**Poziom podstawowy**

Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Бібліі*
Ян Баршчэўскі, *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* (*Плачка*, выбраныя фрагменты)
Канстанцін Вераніцын, *Тарас на Парнасе*
Кастусь Каліноўскі, *Пісьмы з-пад шыбеніцы*, *Мужыцкая праўда № 1*
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*
Францішак Багушэвіч, *Прадмова да Дудкі беларускай, Калыханка,* выбраныя вершы
Змітрок Бядуля, *На Каляды к сыну, Пяць лыжак заціркі*
Цётка, *Шануйце роднае слова*
Максім Багдановіч, *Апокрыф, Хто мы такія, Санет*, выбраныя вершы
Максім Гарэцкі, *Рускі, Стары прафесар*
Янка Купала, *Курган, Незалежнасць*, *Явар і каліна*, *Спадчына*, выбраныя вершы
Якуб Колас, *Новая зямля*, *Што яны страцілі*
Кузьма Чорны, *Макаркавых Волька*
Наталля Арсеннева, *Малітва*, выбраныя вершы
Ларыса Геніюш, *Маці мая сялянская…*, выбраныя вершы
Янка Брыль, *Галя, Маці*
Ян Скрыган, *Слепата*
Іван Шамякін, *Дзеці настаўніцы*
Іван Мележ, *Людзі на балоце* (фрагмент *Сватаўство*)
Барыс Сачанка, *Чаравікі-туфелькі*, *Дарога праз лес*
Уладзімір Караткевіч, *Зямля пад белымі крыламі* (фрагмент раздзела *Зялёны шум*, фрагмент *Людзі зямлі беларускай*), *Дзікае паляванне караля Стаха* (фрагмент *Расказ легенды пра караля Стаха*), *На Беларусі Бог жыве*, выбраныя вершы
Ніл Гілевіч, *Каб людзьмі між людзей пачувацца*
Сакрат Яновіч, *Гасцінец*, *Прыгожай, Бацькаў гнеў*, *Вёха – багіня ганьбы*
Яўгенія Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві...*, выбраныя вершы
Аляксей Дудараў, *Вечар* (фрагменты з дзеі першай)
Васіль Быкаў, *Аблава*, *Калі хочацца жыць*
Алесь Барскі, *Беластоцкі край, Я сын зямлі беластоцкай...*, *Селянін, як тварэц...*, выбраныя вершы
Святлана Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* (фрагмент *Самотны чалавечы голас*)
Барыс Пятровіч, *Спачатку была цемра* (фрагмент 1-га раздзела часткі другой)
Ігар Бабкоў, *Хвілінка* (фрагмент 6-га раздзела часткі *Паветраны шар*).

**Poziom rozszerzony**
Максім Багдановіч, *За сто лет*
Максім Гарэцкі, *Фантазія*
Якуб Колас, *У палескай глушы* (фрагмент *XVI часткі)*
Янка Купала, *Тутэйшыя*
Рыгор Барадулін, *Жыццё і паэзія*
Сакрат Яновіч, *Пад знакам Арла й Пагоні* (фрагмент *30. Эліты)*
Ларыса Геніюш, *Споведзь*
Надзея Артымовіч, *Ёсць тое...*, выбраныя вершы
Алесь Разанаў, *Sumus ne simus*, выбраныя вершы
Вольга Рымша, *Рэквіем*
Уладзімір Арлоў, *Незалежнасць – гэта...*
Барыс Пятровіч, *Трызненні* (фрагмент *Шчасце быць – 1).*

**Inne lektury obowiązkowe zamieszczone w *Informatorze o egzaminie maturalnym z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej od roku szkolnego 2022/2023*, do których również można się odwołać**

**Poziom podstawowy**
Максім Танк, *Рукі маці*, выбраныя вершы
Віктар Швед, *Беласточчына*, выбраныя вершы
Уладзімір Някляеў, *Праводзіла з дому*, выбраныя вершы
Віктар Шніп, *Жыццё, нібыта нітка Арыядны...*, выбраныя вершы.

## Część 1. Test językowy

Przeczytaj uważnie tekst, a następnie wykonaj zadania umieszczone pod nim. Odpowiadaj **tylko na podstawie tekstu** i tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

Вітаўт Чаропка
***Ігнат Буйніцкі стварыў беларускі тэатр і памёр у танцы***

Яго назавуць бацькам беларускага тэатра. Такая гучная адзнака дзейнасці Ігната Буйніцкага цалкам заслужаная. Хоць трэба ўдакладніць гэтае вызначэнне, не проста беларускага, а нацыянальнага тэатра. Усё ж тэатральная гісторыя на Беларусі сягае ў XVIII стагоддзе, а то і раней. Буйніцкі аднавіў тэатральную традыцыю, закладзеную ў сярэдзіне XIX стагоддзя Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам. [...] Поспех тэатра Буйніцкага лагічны і правамерны, ён даў магчымасць беларусам адчуць сябе беларусамі. Яго запальныя танцы пад цымбалы ажыўлялі зачахлы дух гледачоў, напаўнялі іх душы радасцю. Тое, што не магло зрабіць слова, зрабіла яскравае народнае дзейства.

Жыццёвы шлях Ігната пачаўся 10 (22) жніўня 1861 года ў бацькоўскім фальварку Празарокі Дзісенскага павета Віленскай губерні. [...] У сваіх Празароках ён ладзіць канцэрты народнай песні і, як заўсёды, заканчвае іх танцамі. У прадстаўленнях удзельнічалі і дочкі Буйніцкага Ванда і Алена. Неўзабаве слава пра танцораў Буйніцкага дасягнула і Вільні. Іх запрасілі на беларускую вечарынку, якую ладзіла рэдакцыя „Нашай Нівы” 12 лютага 1910 года. Вялізная зала чыгуначнага гуртка была забіта народам. Прыйшлі не толькі беларусы, але чуліся літоўская, руская, польская мовы. Публіка чакала чагосьці незвычайнага. [...] Сапраўднай феерыяй стала выступленне танцавальнай групы Буйніцкага. Пад жвавую музыку скрыпак і цымбалаў пачаліся танцы: „Лявоніха”, „Мяцеліца”, „Юрка” і „Верабей”. «Трэба прызнацца, што яны ўдаліся на хвалу! – пісала „Наша Ніва”. – Публіка проста адурэла. Усе без канца крычалі: „Брава! Біс!”». [...]

Натхнёны поспехам Буйніцкі хвацка ўзяўся за справу, як умеў і любіў рабіць. Дзівацтва для іншых, адданая любоў і захапленне для самога Ігната Буйніцкага перарасло ў культурную місію, стала яго жыццём. У Палівачах Буйніцкі стварае „сінтэтычны сцэнічны калектыў”, куды ўвайшлі драматычная трупа, хор і танцавальная група, музы́кі. [...] Першыя гастролі па Беларусі пачаліся 21 жніўня таго ж 1910 года ў Дзісне. [...] І пайшло-паехала! Свянцяны, Паставы, Полацк – усюды тэатр Буйніцкага ўзрушаў гледача, як сапраўдны віхор, які прынёс у глухія правінцыйныя куткі свежае паветра! [...]

Небывалы поспех беларускага тэатра ўстрывожыў улады, і ў 1912 годзе, як гэта бывала з усім беларускім, забаранілі гастролі. Гэта быў балючы ўдар. [...] Вялікая мара стварыць беларускі народны тэатр, здаецца, загінула. [...] Буйніцкі заняўся гаспадарчымі клопатамі, каб папраўць сваё маёмаснае становішча і зноў узяцца за справу жыцця. У маі 1914 года ў „Нашай Ніве” Буйніцкі друкуе абвестку аб наборы беларускай трупы. Аднак вайна перакрэсліла ўсе планы. [...] Ён пайшоў у армію [...], выкарыстоўваючы гэтую службу дзеля беларускай нацыянальнай прапаганды. [...] І на службе ён знаходзіў магчымасць займацца народнай самадзейнасцю і ладзіць канцэрты. Падчас аднаго з такіх канцэртаў ад перанапружання ў Буйніцкага лінула

з горла кроў і спынілася сэрца. Нешта глыбока сімвалічнае было ў яго смерці: ён нарадзіўся, каб узвысіць народны танец да класічнага мастацтва, і, апантаны сваёй місіяй, памёр у танцы, як герой на полі бою.

zviazda.by

1. 0–1–2

**Заданне 1. (0–2)**

**Дапасуй па адным з прыведзеных пытанняў да канкрэтных абзацаў з тэксту, якія адказваюць на іх. Літарныя абазначэнні пытанняў упішы ў табліцу насупраць нумароў абзацаў.**

*а) Якую ролю ў развіцці беларускага тэатру выканаў Ігнат Буйніцкі?*
*б) З чаго пачалася сцэнічная кар’ера Ігната Буйніцкага?*
*в) Як Ігнат Буйніцкі развіваў гаспадарку ў бацькоўскім фальварку?*
*г) Чаму Ігнат Буйніцкі быў вымушаны прыпыніць дзейнасць?*
*д) Якія адносіны панавалі ў калектыве Ігната Буйніцкага?*

| Абзац | Пытанне |
|---|---|
| 1 | |
| 2 | |
| 4 | |

2. 0–1–2

**Заданне 2. (0–2)**

**Ацані правільнасць сцверджанняў, змешчаных у табліцы. Пазнач ТАК, калі сцверджанне правільнае, або НЕ – калі няправільнае.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | У тэксце пераважае лексіка, уласцівая навуковаму стылю. | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | У тэксце прысутнічае эмацыянальна-экспрэсіўная лексіка. | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | У тэксце прысутнічаюць эпітэты і параўнанні. | **ТАК** | **НЕ** |

3. 0–1

**Заданне 3. (0–1)**

**Тлумачальны слоўнік беларускай мовы для слова *драматычны* падае тры значэнні. З якім з іх суадносіцца гэтае слова ў трэцім абзацы? Выберы і пазнач правільны адказ.**

1. Які мае адносіны да драмы (у 1, 2 знач.). *Драматычны тэатр. Драматычны твор.*
2. Поўны драматызму (у 2 знач.). *Драматычны выпадак. Драматычная развязка.*
3. Моцны, крыху рэзкі па тэмбру, у адрозненне ад лірычнага (пра голас спевака). *Драматычны тэнар. Драматычнае сапрана.*

*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*, skarnik.by

**Заданне 4. (0–2)**

**Ацані згоднасць прыведзеных ніжэй сцверджанняў з тэкстам Вітаўта Чаропкі. Калі сцверджанне праўдзівае, пазнач П, калі не – пазнач Н.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Ігнат Буйніцкі першым на беларускіх землях пачаў развіваць тэатр. | **П** | **Н** |
| **2.** | Пачаткі дзейнасці Ігната Буйніцкага мелі месца ў яго родным фальварку. | **П** | **Н** |
| **3.** | Справай жыцця Буйніцкі лічыў дабрабыт гаспадаркі, якую ён атрымаў у спадчыну. | **П** | **Н** |

4.
0–1–2

**Заданне 5. (0–2)**

**Да кожнага з прыведзеных ніжэй слоў падбяры антонім.**

разбурыць – ……………………………………………………………………………………..

правал – ………………………………………………………………………………………

чужы – …………………………………………………………………………………………

5.
0–1–2

**Заданне 6. (0–1)**

**Растлумач сваімі словамі значэнне наступнага параўнання з трэцяга абзаца:** ***усюды тэатр Буйніцкага ўзрушаў гледача, як сапраўдны віхор, які прынёс у глухія правінцыйныя куткі свежае паветра.***

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

6.
0–1

## Część 2. Test ze znajomości lektur i kontekstów

Wykonaj zadania. Odpowiadaj tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

7.
0–1–2

### Заданне 7. (0–2)

**Запоўні табліцу. Падбяры да твораў 1–3 эпоху/літаратурны метад, да якіх яны адносяцца. Упішы адпаведную літару А–Г у табліцу.**

| | Твор і аўтар | эпоха/метад |
|---|---|---|
| **1.** | *Прадмова да ўсёй Бібліі*, Францыск Скарына | |
| **2.** | *Рускі*, Максім Гарэцкі | |
| **3.** | *Плачка*, Ян Баршчэўскі | |

**А.** Рэалізм
**Б.** Рамантызм
**В.** Адраджэнне
**Г.** Сентыменталізм

### Заданне 8. (0–1)

Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент *Тараса на Парнасе* Канстанціна Вераніцына.

Няптун з прыгожанькай наядай
Пайшоў упрысядку „казака”;
Нябось, і ў старога гада
Кроў грае, як і ў дзецюка,
А во й сам Юпітар з Вестай, –
Пусціўся, стары хрэн, у пляс,
Як бы жаніх перад нявестай,
Заткнуў ён рукі за пояс.
А во й Марс у новых ботах;
Ён, мусіць, ботаў не жалеў,
Бо з німфамі скакаў да поту,
Гуляў у жмуркі і шалеў.

Канстанцін Вераніцын, *Тарас на Парнасе*, knihi.com

8.
0–1

**На падставе прыведзенага фрагмента і ўсяго твора давядзі, што ў ім прысутнічае гумар. Падай адзін аргумент.**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 9.**

Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент паэмы *Курган* Янкі Купалы.

Акалічны народ гуслі знаў гусляра;
Песня-дума за сэрца хапала;
Вакол гэтай думы дудара-званара
Ка́зак дзіўных злажылась нямала.

Кажуць, толькі як выйдзе і ўдарыць як ён
Па струнах з неадступнаю песняй, –
Сон злятае з павек, болю цішыцца стогн,
Не шумяць ясакары, чарэсні [...]

Вось настроіў, навёў тон у струнах як след,
Не зірнуўшы на гулі ні разу,
І сядзіць гэты **сумны, як лунь, белы дзед,**
І чакае ад князя прыказу.

Янка Купала, *Курган*, knihi.com

**Заданне 9.1. (0–1)**

**Сярод варыянтаў А–Г выберы і пазнач той, дзе правільна названы выдзелены ў фрагменце троп.**

**А.** Метафара
**Б.** Гіпербала
**В.** Параўнанне
**Г.** Супрацьпастаўленне

| 9.1. |
|---|
| 0–1 |
| |

**Заданне 9.2. (0–2)**

**На падставе прыведзенага фрагмента і ўсяго твора давядзі, што гусляр з'яўляецца рамантычным героем. Падай два аргументы на карысць гэтай тэзы.**

1) ……….………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

2) ……….………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

| 9.2. |
|---|
| 0–1–2 |
| |

## Заданне 10.

Прачытай прыведзены ніжэй верш Ларысы Геніюш *Маці мая сялянская…*

***
Маці мая сялянская,
маці мая славянская,
ветлівая, гасцінная,
ў крыўдзе чужой
непавінная.
Ураджайная і зялёная,
хлебам слаўная ад вякоў,
неспакойная, неўгамонная
ды бунтарская ў жылах кроў.
Гаспадарыла
ды батрачыла –
намагалася за дваіх.
Не хачу я чужое
мачыхі
аглядаць
на слядох тваіх!
Ты – мой боль круты,
ты – мой шлях святы,
сцежка верная ў цішыне.
Ўсё мне дорага,
што прыдбала ты
працай, сілаю для мяне.
Ты – як праўда праўд,
ўсюды свой і брат,
мовы роднае
звонкі дар.
Ты – мой шлях круты,
ты – мой боль святы,
Беларусь мая,
мой алтар.

Ларыса Геніюш, *Маці мая сялянская…*, rv-blr.com

10.1.
0–1

## Заданне 10.1. (0–1)

**Выберы і пазнач сярод варыянтаў А–Г, да якога тыпу лірыкі адносіцца прыведзены верш.**

**А.** Філасофская
**Б.** Інтымная
**В.** Грамадзянская
**Г.** Пейзажная

**Заданне 10.2. (0–1)**

**Растлумач, якую функцыю ў творы выконвае вобраз маці.**

………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………

| 10.2. |
| --- |
| 0–1 |
| |

**Заданне 11. (0–2)**

Прачытай прыведзены фрагмент апавядання *Рускі* Максіма Гарэцкага.

А таму хвораму на грудзі салдату-беларусу, што прывезлі з аўстрыйскага фронту, болей выпадае ляжаць у бальніцы для нервовахворых, чым тут, у нас. Ён ляжыць на Саксанавым месцы.

Наша палата празвала яго Рускім, бо ён, калі яго забірае хвароба, крычыць шмат разоў бесперастанку:

– Я рускі! Я рускі! Рускі, рускі!..

На выгляд гэта ёсць даволі здаровы мужчына. Ён сярэдняга росту, добрага складу, шыракаплечы, і грудзі ў яго звычайныя. На твары ніякай хваравітасці не відаць, – пэўна ж, калі ўважаць на тое, што чалавек прыехаў не з гасцей, а з акопаў. І толькі ў вачах гаротніка ё штосьці такое, што выдае цяжкую хваробу, і му́ку, і безнадзейнасць. Вочы ў яго праваліліся, зрабіліся маленькімі. Галоўнае ж, яны страшэнна змарнаваныя, нейкія змятыя, сцёртыя. Трэба прыглядзецца да іх, і тады відаць у іх боль.

Дзіўная гісторыя з гэтым нешчаслівым чалавекам выйшла.

Максім Гарэцкі, *Рускі*, knihi.com

**На падставе прыведзенага фрагмента і ўсяго апавядання назаві падзею з гісторыі беларускага народа, пра якую вядзецца гаворка, і коратка абгрунтуй сваю думку.**

| 11. |
| --- |
| 0–1–2 |
| |

Падзея: ………………………………………………………………………………………

Абгрунтаванне: ………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………

**Zadanne 12. (0–30)**

**Część 3. Wypracowanie**

Выберы **адну** з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.

- У сачыненні паразважай над **праблемай**, зададзенай у тэме. Выкладзі **сваю думку** і **абгрунтуй** яе.
- У развагах прадстаў **аргументы**, спасылаючыся на **літаратурны твор**, згаданы ў тэме, і на **іншы твор беларускай літаратуры**.
- Твая праца павінна складацца не менш чым з **250 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.
- Сачыненне напішы па-беларуску.

Тэма 1.
**Вобразы Беларусі ў беларускай літаратуры. Прадстаў тэму на падставе верша Уладзіміра Караткевіча *На Беларусі Бог жыве…* і выбранага твора беларускай літаратуры.**

Уладзімір Караткевіч
***На Беларусі Бог жыве...***

„На Беларусі Бог жыве", –
Так кажа мой просты народ.
Тую праўду сцвярджае раса ў траве
І адвечны зор карагод.
Тую праўду сцвярджае
Упартасць хваль,
І продкаў запавет,
І мовы залатая сталь,
І нашых дум сусвет.
Тую праўду сцвярджае
Ўсё зноў і зноў
Ўсім лёсам, –
Няхай спакваля, –
У хмарах дубоў,
У вясёлках агнёў
Купальская наша зямля.
І няхай давядзе мне
Іншая кроў,
Што брашу,
Як сабачы сын, –
А няма нідзе
Вярнейшых сяброў
І прыгажэйшых жанчын.
Гэта край раскрытых душ і дзвярэй,

Гэты край –
Твой дом і сабор...
Ў нас дваццаць з лішнім тысяч рэк,
Адзінаццаць тысяч азёр.
Нам ёсць што піць,
З падмосткаў ліць,
Чым палі свае акрапіць,
А як давядзе, то ёсць нам дзе
І ворага ўтапіць.
І тая памяць жыве не ў царкве,
А ў кожнай жыве галаве:
„На Беларусі Бог жыве...” –
І хай сабе жыве.
А калі ён шле на нас кару і гнеў, –
Ну што ж, – мы з ім свае:
Ў вяршыні самых гонкіх дрэў
Маланка з неба б’е.

У вяршыні маленькіх і ніцых дрэў
Маланка ніколі не б’е.

І пра тое кожны пяе салавей
Росным кветкам у роднай траве:
„На Беларусі Бог жыве”–
І няхай давеку жыве.

Уладзімір Караткевіч, *На Беларусі Бог жыве...*, knihi.com

Тэма 2.
**Што прыносіць вайна звычайным людзям? Паразважай над пытаннем на падставе апавядання Васіля Быкава *Калі хочацца жыць...* і выбранага твора беларускай літаратуры.**

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr** ☐

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

**Tabele wypełnia egzaminator!**

| 1. | Spełnienie formalnych warunków polecenia | 0 | 1 | Brak lektury obowiązkowej. | Nie dotyczy problemu. | Nie jest wypowiedzią argumentacyjną. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | *Jeżeli **0 pkt** – wskaż powód.* | | |

| 2. | Kompetencje literackie i kulturowe | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | Liczba błędów rzeczowych | OGÓŁEM KLiK |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 9 | 10 | 11 | 12 | | | | | | | |

| 3a | Struktura wypowiedzi | 0 | | 1 | | 2 | | 3 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | G | F | E | C | D | B | |

| 3b | Spójność wypowiedzi | Liczba błędów w spójności | 0 | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|---|---|---|

| 3c | Styl wypowiedzi | 0 | 1 |
|---|---|---|---|

| 4a | Zakres i poprawność środków językowych | Liczba błędów językowych | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1G, 2F, 3E, 2G, 3F, 3G | 1F, 2E, 3D | 1E, 2D, 3C | 1D, 2C, 3B | 1C, 2B, 3A | 1B, 2A | 1A |

| 4b | Poprawność ortograficzna | Liczba błędów ortograficznych | 0 | 1 | 2 |
|---|---|---|---|---|---|

| 4c | Poprawność interpunkcyjna | Liczba błędów interpunkcyjnych | 0 | 1 | 2 |
|---|---|---|---|---|---|

**Łączna liczba punktów: ……………………**

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*


# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*